С.А.Валахановіч,
ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры

# САМАСТОЙНЫЯ ФОРМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ

Педагагічная практыка садзейнічае ўдасканаленню засвоеных ведаў, уменняў і навыкаў не толькі ў працэсе навучання, але і шляхам самаадукацыі. Студэнтам прыходзіцца сістэматычна, мэтанакіравана вырашаць кола пастаўленых педагагічных задач, сярод якіх — уменне працаваць з навучэнцамі рознага ўзросту, уплываць на працэс зносін у ходзе заняткаў, выкананне этычных прынцыпаў і інш. Педагагічная практыка патрабуе наяўнасці абавязковых прафесійных якасцей: псіхалагічнай граматнасці, далікатнасці, эмпатыі і інш. Гэтыя асаблівасці самастойных прафесійных крокаў грунтуюцца на ўменні займацца самаадукацыяй, самакіраваць і самаўдасканальваць сваю асобу.

Самастойныя формы трэніроўкі прафесійных уменняў і навыкаў патрэбны ў працэсе абагульнення псіхолага-педагагічнай, спецыяльнай і метадычнай літаратуры, яе логіка-дыдактычнага аналізу, вывучэння і абагульнення асабістага педагагічнага вопыту.

На педагагічнай практыцы выпрацоўваюцца ўменні самастойна ў працэсе вучэбна-творчых заняткаў распрацаваць тэму, прадумаць спецыфіку заданняў вучэбных дзеянняў, кантролю і самакантролю навучэнцаў, засяродзіць свае педагагічныя намаганні на дакладным выкананні асноўных патрабаванняў вучэбнай дзейнасці. Важным з'яўляецца стыль узаемаадносін паміж педагогам-студэнтам і вучнем.

Адной з самастойных формаў трэніроўкі прафесійных уменняў і навыкаў з'яўляюцца педагагічныя зносіны. Гэта самая эканомная, жывая і плённая вобласць самаўдасканалення. Яна дапускае развіццё камунікатыўнага ўзроўню і патэнцыялу студэнта да такой ступені, якая дазволіць яму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўна ўключыцца ў працэс міжасобасных зносін. Дзеля гэтага патрэбна авалодаць:

— уменнем паводзіць сябе ў крытычнай або канфліктнай сітуацыі;

— уменнем знайсці падыход да навучэнца, зразумець і падтрымаць яго;

— уменнем самавыяўлення, дакладнай фармулёўкі сваёй думкі, падмацаванне яе жэстамі і мімікай;

— уменнем мадэліраваць псіхічны стан асобы навучэнца;

— уменнем убачыць у ім добрыя, маральныя якасці;

— уменнем выклікаць прыхільнасць да сябе і выклікаць да зносін.

Такім чынам, студэнту патрэбны комплекс уменняў, дзе асабіста важныя: высокі ўзровень агульнай культуры, культуры мыслення, культуры моўных сродкаў і спосабаў фарміравання і фармулявання думкі, культура міжасобаснага ўздзеяння, што выклікае адэкватную адказную рэакцыю, культуру прагназіравання адказнай рэакцыі партнёра па зносінах, культуру падтрымання зносін. Гэтага можна дасягнуць як у працэсе вывучэння курса “Псіхалогія зносін”, так і самастойна, выкарыстоўваючы розныя псіхагімнастычныя трэнінгі і практыкаванні.

Педагагічная практыка дазваляе студэнту набыць вопыт эмацыянальнага і асэнсаванага вучэбна-выхаваўчага працэсу, уменне станавіцца на пункт гледжання вучня, глядзець на сам працэс навучання яго вачыма, уменне карыстацца механізмам рэфлексіі, гэта значыць разумець вучня, абапіраючыся на розум, лагічныя сувязі. Тут без самастойнай і разумна арганізаванай сістэматычнай трэніроўкі ўменняў і навыкаў у працэсе педагагічнай дзейнасці не абысціся.

Самаадукацыя студэнтаў у перыяд педагагічнай практыкі — асаблівая сфера пазнавальна-творчай дзейнасці. Яна мае адносную самастойнасць, закончанасць, патрэбу ў дапамозе і адпаведнай псіхолага-педагагічнай арганізацыі. Каб дасягнуць пастаўленай мэты ў працэсе практыкі, неабходна ажыццявіць складаную пошукавую дзейнасць, якая маг-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыма пры наяўнасці пэўных ведаў, уменняў і навыкаў. Сярод іх: авалоданне элементарнымі педагагічнымі дзеяннямі і алгарытмамі педагагічнай практыкі; прафесійна-асобаснай матывацыяй, што ўключае ўсведамленне сябе як творцы ў педагагічным працэсе, пазнанне сваіх моцных і слабых бакоў праз аналіз фактаў уласнай педагагічнай дзейнасці, разуменне перспектыў развіцця творчай індывідуальнасці сваёй асобы.

Гэтая ўсвядомленая работа па ўдасканальванні сябе як прафесіянала патрабуе ўмення адаптаваць свае індывідуальна-непаўторныя асаблівасці да патрабаванняў педагагічнай дзейнасці прафесійных "чалавеказнаўцаў", бесперапынна ўдасканальваць творчы, пазнавальны, цэннасна-арыентаваны і мастацкі патэнцыялы сваёй асобы.

Асноўнымі ўмовамі самаадукацыйнай дзейнасці студэнтаў з'яўляюцца, па-першае, маральна-валявая гатоўнасць да такой дзейнасці (індывідуальна-псіхалагічны аспект); па-другое, вучэбна-метадычная гатоўнасць студэнтаў да самаадукацыі (арганізацыйна-метадычны аспект); па-трэцяе, аспект перспектывы, адлюстраваны ў мэтанакіраванасці педагагічнай самаадукацыі, ва ўменнях студэнтаў вызначыць і рэалізаваць перспектывы і бліжэйшыя задачы з мэтай дасягнення якасцей, неабходных у педагагічнай дзейнасці. Толькі адчуванне перспектывы забяспечыць студэнту магчымасць удасканалення прафесійных уменняў і навыкаў у перыяд практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л.А.Ванкевіч,**
**загадчык аддзела**
**Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў г. Мінска**

## ПРАКТЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ НА БАЗЕ ПАЛАЦА ЧЫГУНАЧНІКАЎ

У апошні час узрастае значэнне такіх дзелавых якасцей сацыяльнага педагога, арганізатара вольнага часу, як кам-